**Водзыў**

на аўтарэферат дысертацыі
Косцінай Жанны Вячаславаўны
«Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Даследаванне эстэтычнага зместу літаратуры адносіцца да ліку першачарговых задач літаратуразнаўства, абумоўленых самой сутнасцю мастацтва слова ўдасканальваць чалавечае быццё. У рабоце Косцінай Ж.В. гэты даследчы кірунак рэалізоўваецца на аснове аналізу твораў літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. Пастаўленая ў дысертацыі праблема ўвасаблення эстэтычнага ідэалу бачыцца важным інструментам спасціжэння каштоўнасных арыенціраў мастацтва слова дадзенага перыяду і іх уплыву на станаўленне новай беларускай літаратуры ў цэлым.

З аўтарэферата вынікае, што асноўная мэта даследавання па вылучэнні і апісанні спецыфікі выяўлення эстэтычнага ідэалу дасягаецца праз аналіз твораў, прыналежных да розных жанраў і значнай колькасці аўтараў. Такі выбар матэрыялу даследавання валодае неабходнай рэпрэзентатыўнасцю і ў поўнай меры выкарыстоўваецца дысертантам для прадстаўлення асаблівасцей ўвасаблення эстэтычнага ідэалу. Косціна Ж.В. абгрунтоўвае ролю рамантычнай іроніі ў выяўленні эстэтычных прынцыпаў мастацтва слова першай паловы XIX ст., слушна акцэнтуе ўвагу на ролі хрысціянскіх каштоўнасцей і гісторыка-патрыятычных вобразаў у выражэнні ўяўленняў тагачасных аўтараў аб дасканаласці, вылучае важныя для эстэтычнага развіцця беларускай паэтычнай карціны свету вобразы кветак, рэк, кургана.

Змест аўтарэферата сведчыць, што Ж. В. Косціна сістэматызавала ў працэсе даследчай дзейнасці багаты літаратуразнаўчы матэрыял. Аўтарам дысертацыі выкарыстаны адпаведны методыка-метадалагічны інструментарый, які грунтуецца на сістэматызацыі і абагульненні папярэдняга навуковага вопыту. Атрыманыя вынікі пераконваюць у грунтоўным падыходзе дысертанткі да асэнсавання вылучанай праблемы і належным узроўні яе даследчыцкіх кампетэнцый.

Разам з тым, на наш погляд, дадатковага тлумачэння ў аўтарэфераце патрабуюць наступныя пазіцыі:

1. Даследаванне выходзіць за заяўленыя ў тэме храналагічныя межы першай паловы XIX ст., і ўключае, напрыклад, творы В. Каратынскага, творчасць якога развівалася ў асноўным пасля 1850-га года.

2. Паколькі вытокі беларускага фальклору бяруць пачатак у дахрысціянскі час, то патрабуе абгрунтавання тэзіс “Крыніцай прыгожага для Я.Чачота была вусная народная творчасць, бо толькі яна змагла захаваць хрысціянскае разуменне сутнасці прыроды, сацыяльных паводзін асобы” [с.13].

3. Патрабуе ўдакладнення тое, што дысертант разумее пад “праблемай вытокавага перыяду” [17]

Аднак дадзеныя заўвагі маюць рэкамендацыйны характар і не зніжаюць навуковую значнасць даследавання, праведзенага Касцінай Ж.В. На аснове тэксту аўтарэферата можна канстатаваць, што дысертацыйнае даследаванне «Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя» выканана на належным навуковым узроўні, а яго аўтар Ж. В. Касціна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі
і перападрыхтоўкі кадраў УА “Мазырскі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” П. Р. Кошман

Азнаёмлена
28.01. 2025
Ж.В. Касціна

Водгук паступіў
у савет па абароне
дысертацый Д 01.42.04
27.01. 2025 г.
вучоны сакратар
(Богдан Е. И.)